ДУА «Міёрская сярэдняя школа № 2 імя М. Р. Ізварына»

# Інтэлетуальная гульня
# «Мая  маленькая радзіма»

Складальнік Сушко В. І.

**Тэма:** “Мая  маленькая радзіма”
**Мэты**: спрыяць фарміраванню пачуцця прыналежнасці да Айчыны, развіваць уменне працаваць у камандзе, будаваць лагічныя і зразумелыя для субяседніка выказванні; выхоўваць цікавасць і жаданне больш даведацца пра малую радзіму.
**Форма правядзення**: інтэллектуальная гульня.
**Умовы правядзення гульні**: гульня праводзіцца ў тры туры. У ёй можа прымаць улзел любая колькасць каманд, склад удзельнікаў якіх – 6 чалавек.

**Ход мерапрыемства**

1. Уступнае слова: знаёмства з правіламі гульні.
2. Гульня  па турах.

Тур 1. “Алфавіт”

*Умовы правядзення тура*: адказы на пытанні ў гэтым туры пачынаюцца з адпаведнай літары алфавіта. Камандам перад пачаткам спаборніцтва выдаецца бланк, у якім удзельнікі запісваюць адказы і выстаўляюцца балы. За кожны правільны аказ налічваецца 1 бал. На абдумванне даецца 10 секунд.

Пытанні тура

| Літ. | Заданне | Адказ |
|---|---|---|
| **А** | Назавіце аўтара герба горада Міёры. | Альхімовіч Т. А. |
| **Б** | Хто быў арганізатарам будаўніцтва новага Успенскага касцёла ў горадзе Міёры ў 1905 годзе? | Бародзіч Іосіф – ксёндз |
| **В** | У 2-ой палове XIX стагоддзя ля касцёла ў Міёрах праводзіліся кірмашы. У якім месяцы яны звычайна былі? | Верасень |
| **Г** | Вызначце па наступным апісанні, аб чым ідзе размова: “У блакітным полі іспанскага шчыта тры срэбныя хвалістыя пасы, над імі – срэбны лебедзь з паднятымі крыламі”. | Герб горада Міёры |
| **Д** | Рэвалюцыянер, палітычны дзеяч і таленавіты скульптар XIX стагоддзя, выхадзец  з вёскі Забалоцце Міёрскага раёна. | Дмахоўскі Генрых |
| **Е** | Гідралагічны заказнік на тэрыторыі Міёрскага раёна. | Ельня |
| **Ж** | Гэты кароль у 1567 годзе даў гораду Дзісна новыя льготы і герб “Тры вежы з муру”. | Жыгімонт Аўгуст |
| **З** | Пра гэта прадпрыемства сёння мала хто з жыхароў горада Міёры згадае. Але вядома, што яно працавала да 1931 года. Што гэта было за прадпрыемства? | Зпалкавая фабрыка |
| **І** | У гэтай  вёсцы Міёрскага раёна знаходзіцца адзіны ў Беларусі касцёл, пабудаваны ў стылі мадэрнізму. | Ідолта |
| **К** | Самае старажытнае паселішча Міёрскага раёна, апошнім гаспадаром якога быў Уладзіслаў Федаровіч, любіцель садоў і кветак. | Крычава |
| **Л** | Выява якой птушкі ўпрыгожвае герб горада Міёры? | Лебедзь |
| **М** | Суддзя земскі браслаўскі, што заснаваў праваслаўны манастыр у горадзе Міёры. | Мірскі Севасцян Святаполк |
| **Н** | У якім стылі пабудаваны Успенскі касцёл у Міёрах? | Неаготыка |
| **О** | Вёска Ворцы (Павяцкі сельсавет) Міёрскага раёна ў 1588 годзе адносілася да ўласнасці Сапегі пад крыху іншай назвай. | Ореч |

| | | |
|---|---|---|
| | Як тады называлася гэтая вёска? | |
| **П** | Сёння гэта толькі вёска Міёрскага раёна, а ў XVI стагоддзі гэта быў горад, якому ў 1571 годзе кароль Жыгімонт Аўгуст даў Магдэбурскае права. Што гэта за вёска? | Пераброддзе |
| **Р** | Каму належыў горад Міёры ў 1633 годзе? | Рыле А. |
| **С** | Паэты – бацька і сын – выхадцы з Міёрскага раёна. Назавіце іх прозвішча. | Сушко Павел, Сушко Пётр |
| **Т** | Віцэ-адмірал, Герой Савецкага Саюза, выхадзец з горада Міёры. У яго гонар названа ў 2009 годзе вуліца роднага горада. Назавіце прозвішча гэтага чалавека. | Томка Я. А. |
| **У** | Назва гэтай вёскі славянскага паходжання, азначае “ўзвышша”. Сама ж вёска калісьці належыла роду Агінскіх Што гэта за вёска Міёрскага раёна? | Узмёны |
| **Ф** | Выхадзец Міёрскага раёна Аляксандр Дзмітрыевіч Панізнік – баец французскага Супраціўлення, калі вярнуўся ў родныя мясціны, ад сваіх аднавяскоўцаў у жарт атрымаў мянушку. Як яго называлі аднавяскоўцы? | Француз |
| **Х** | Да якога літаратурнага жанра адносіцца серыя кніг “Памяць” (“Памяць. Міёрскі раён”)? | Хроніка |
| **Ц** | Збіральнік фальклора, кіраўнік дзяржаўнага народнага хора БССР, нарадзіўся ў вёсцы Новы Пагост Міёрскага раёна. | Цітовіч І. І. |
| **Ч** | Жыхары гэтай вёскі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўваходзілі ў склад падпольнага партызанскага атрада “Масква” пад кіраўніцтвам настаўніцы А. М. Манцэвіч. Назавіце гэтую вёску. | Чэрасы |
| **Ш** | Беларускі мастацтвазнавец, уражэніц Міёрская раёна, мастак, у творчасці якога значнае месца займаюць матывы роднай Міёршчыны. Назавіце яго прозвішча. | Шамшур В. В. |
| **Э** | 1712 год у горадзе Дзісна Міёрскага раёна быў названы “чорным часам”. Што дало гэтаму падставу? | Эпідэмія чумы |
| **Ю** | Назавіце прозвішча камандзіра партызанскай брыгады “Кастрычнік”, што дзейнічала ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Міёрскага раёна. | Юрчанка Ф. К. |
| **Я** | Першая буйная аперацыя брыгады Кароткіна – разгром нямецкага гарнізона на гэтай чыгуначнай станцыі. Назавіце гэтую станцыю. | Язвіна |

Тур 2. “Брэйн-рынг”

*Умовы правядзення тура*: на падрыхтоўку адказу камандам даецца 1 мінута. Першай адказвае каманда, якая падала сігнал. Калі дадзены няправільны адказ, астатнім удзельнікам даецца яшчэ 30 хвілін. Кожны правільны адказ ацэньваецца ў 1 бал.

Пытанні тура.

1. У якім годзе Міёры атрымалі статус горада? (*1972 год*)
2. У кожнага горада ёсць месца, архітэктурнае збудаванне, што з’яўляецца візітнай карткай: Эйфелева башня – Парыж, Чырвоная плошча – Масква, Нацыянальная

бібліятэка – Мінск, Біг-Бэн – Лондан. Што з’яўляецца візітнай карткай горада Міёры? (*Набярэжная*)

3. “Бальшавіцкая трыбуна”, “Зара камунізму”, “Сцяг працы”. А сёння? (“*Міёрскія навіны*”)
4. Дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі раёна знаходзіўся партызанскі аэрадром? (*вёска Ельня*)
5. Якія вуліцы горада Міёры названы ў гонар землякоў? (*С. Закрэўскага, Я. А. Томка*)
6. “Тры вежы з муру”, “Ладдзя”, “На зялёным полі залаты сноп ільну”. Аб чым ідз гаворка? (*Герб горада Дзісна*)

Тур 3. “Паняцці”

*Умовы правядзення тура*: камандам даецца 6 паняццяў: “паэт”, “дойлідства”, “вада”, “мастак”, “суполка”, “святыня”. Удзельнікам неабходна адказаць, што ці хто схаваны за гэтымі паняццямі. Для гэтага прапануюцца тры азначэнні да кожнага паняцця. Калі каманда дала правільны адказ пасля першага азначэння, яна атрымлівае 3 балы, калі пасля другога – 2 балы, пасля трэцяга – 1 бал. Паняцці выбіраюцца па чарзе кожнай камандай. Права адказаць мае толькі тая каманда, якая выбрала гэта паняцце.

Паэт

1. Паэт пачаў друкавацца ў раённай газеце ў 1954 годзе. Аўтар гумарыстычна-сатырычных зборнікаў, першага ў беларусі вянк парадыйных санетаў. Плённа працаваў у лірыцы.
2. На выбар шляху гэтага чалавека аказала непасрэднае ўздзеянне творчасці бацькі.
3. Памяць аб ім у горадзе Міёры была ўвасоблена ў мемарыяльнай дошцы на будынку школы, якую ён скончыў у 1956 годзе. (*Сушко Пётр Паўлавіч*)

Дойлідства

1. Самы старажытны будынак на тэрыторыі раёна, пабудаваны ў 1750 годзе з цэглы ў стылі барока. У час паўстання 1831 года быў часткова разбураны і адноўлены ў першапачатковым выглядзе толькі ў 1898 – 1910 гг.
2. Аб’ёмна-прасторавая кампазіцыя дома сіметрычна-восевая, трохчастковая. Цэнтральны двухпавярховы аб’ём завершаны фігурным франтонам, бакавыя – трохвугольнымі франтонамі з авальнымі люкамі. Будынак мае масіўны цокальны паверх з лучковымі праёмамі. Да галоўнага ўваходу вялдзе шырокая двухбаковая лесвіца з тэрасай.
3. Дом – цэнтральная пабудова сядзібы, размешчанай на паўночна-заходняй ускраіне вёскі на левым беразе Дзвіны. Гэта белы палац быў узведзены мясцовымі майстрамі для пісара Вялікага Княства Літоўскага. (*Сядзібны дом Лапацінскіх у вёсцы Лявомпаль*)

Вада

1. Адно з найбольш буйных азёр Міёрскага раёна (5, 42 км$^2$). У ім самая нізкая мінеральнасць вады.
2. Адносіцца да дыстрофных, але зарастае слаба. Знаходзіцца ў ліку самых чыстых.

3. Адносіцца да групы балотных азёр, размешчана на тэрыторыі аднаіменнага гідралагічнага заказніка (*Ельня*)

Мастак

1. Выхадзец з Міёрскага раёна. Працуе ў ВДПУ імя П. М. Машэрава з 1970 года. Дацэнт, прафесар.
2. Адзін з першых беларускіх даследчыкаў творчасці Малевіча, Шагала, Лісіцкага, іншых мастакоў у паслярэвалюцыйным Віцебску.
3. Актыўна займаецца творчай дзейнасцю. Удзельнік мастацкіх выстаў. Праце ў станкавай графіцы. Стварыў серыю графічных работ. (*В. В. Шамшур*)

Суполка

1. Для размяшчэння гэтай установы былі перабудаваны і добра прыстасаваны будынкі царскай турмы ў горадзе Дзісна.
2. Апекаваўся над установай ксёндз Рыгор Пірамовіч, а ўзначальваў доктар Тадэвуш Станеўскі, па ініцыятыве якога выдаваўся часопіс “Наш голас”.
3. Гэта ўстанова праіснавала да 17 верасня 1939 года і заўсёды была на высокім узроўні адукацыі і выхавання таго часу. (*Дзісненская гімназія*)

Святыня

1. Найбольш старажытны з культавых устаноў, якія поўнасцю або часткова захаваліся (1773 г.) на тэрыторыі Міёрскага раёна.
2. Ён вельмі пацярпеў у гады Вялікай Айчыннай вайны і да гэтага часу не адрэстўрыраваны.
3. Рэшткі гэтага архітэктурнага помніка можна пабачыць у горадзе Дзісна. (*Францысканскі касцёл горада Дзісна*)

3. Падвядзенне вынікаў. Узнагарода пераможцаў.